Яноўскі, А.А. Імёны ў летапісе Беларускага універсітэта / А. А. Яноўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 91–98

***А. А. ЯНОЎСКІ***

# ІМЁНЫ Ў ЛЕТАПІСЕ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА

БДУ быў створаны ў 1921 г. Але каб ён распачаў сваю дзейнасць 31 кастрычніка 1921 г., спатрэбілася амаль 2 гады. Яны прайшлі ў напружанай працы дзвюх камісій — мінскай і маскоўскай. Гэты падзел адной справы на дзве арганізацыйныя структуры меў сваю логіку і ў нейкай ступені сімвалічны.

Па-першае, стварыць з «нуля» ў Беларусі універсітэт маглі толькі кампетэнтныя, «універсітэцкія» людзі. А гэта значыць, што імі маглі быць у большасці сваёй прадстаўнікі расійскіх універсітэтаў, пераважна вопытная і аўтарытэтная прафесура былых імператарскіх і іншых вну. Па-другое, бела-



рускі універсітэт мог адбыцца ў першую чаргу з-за зацікаўленасці ў яго існаванні мясцовых нацыянальна арыентаваных кадраў невялікай, але вельмі энергічнай групы беларускай інтэлігенцыі. Нельга не прыняць да ўвагі, так сказаць, і «актуальнасць палітычнага моманту» — савецкія ўлады і Масквы, і Мінска, а асабліва партыйныя органы рабілі вялікія намаганні, каб праз стварэнне універсітэта ўвасобіць сацыяльна-культурную праграму новай улады, тым больш у тым рэгіёне былой царскай Расіі, дзе пытанне аб універсітэце шмат разоў «клалася пад сукно» уладай старой, звергнутай.

Такім чынам, стварэнне БДУ у тыя гады залежала ад аб’ектыўных прычын — гэта было аб’ектыўна-палітычным пытаннем, ад вырашэння якога павінна была зыходзіць магчымасць культурна-цывілізацыйнага ўздзеяння на беларускае грамадства, стварэння ядра беларускай інтэлігенцыі, кадраў высокапрафесійных работнікаў. А галоўнае — магчымасць адукацыі і выхавання кадраў новай, савецка-бальшавіцкай генерацыі. Між тым універсітэт у Мінску ўзнік, разгарнуў сваю дзейнасць, стаў адпавядаць асноўным канонам класічных універсітэтаў у многім дзякуючы фактару суб’ектыўнаму, а дакладней таму, што вакол сябе ён сабраў плеяду выдатных вучоных, педагогаў, арганізатараў навукі і адукацыі, проста апантаных сваёй справай людзей, незалежна ад іх паходжання, нацыянальнасці ці палітычных поглядаў.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што толькі праз неверагодна цяжкую, апантаную працу тых, хто ў 20—30-я гг. уваходзіў ва універсітэцкія кабінеты і аўдыторыі, і змог быць створаны ў Беларусі БДУ не толькі як вучэбна-навуковая ўстанова, але і асобная, універсітэцкая сфера жыццядзейнасці грамадства, праяўленне яго агульнакультурнага развіцця.

Калі паспрабаваць скласці больш-менш пэўны пералік імён людзей, якія ўнеслі свой важкі ўклад у нарошчванне патэнцыялу БДУ, размясціць іх у некаторым сістэмным парадку, то пад першымі нумарамі, безумоўна, неабходна нагадаць «бацькоў-заснавальнікаў» універсітэта. І іх нямала, бо колькасць членаў дзвюх нагаданых вышэй арганізацыйных камісій складала некалькі дзесяткаў чалавек. Сярод тых, каму БДУ абавязаны сваім існаваннем, асобнае месца займаюць Я. Ф. Карскі і М. В. Доўнар-Запольскі. Якраз яны сталі першымі складальнікамі канцэпцыі стварэння беларускага універсітэта, пасля таго як кастрычніцкія падзеі 1917 г. разгарнуліся ў Беларусі. Вядома, што ў снежні 1917 г. І Усебеларускі з’езд побач з палітычнымі пытаннямі дэталёва абмяркоўваў пытанне аб шляхах і магчымасцях адкрыцця «першага беларускага універсітэта». Спецыяльны даклад на гэтую тэму зрабіў Яўхім Фёдаравіч Карскі — акадэмік Расійскай АН [1]. Ён жа разам з Доўнар-Запольскім сваё бачанне беларускага універсітэта разгарнуў у



праекце, падрыхтаваным для ўрада БНР. Карскі — гэта тая асоба, якая, можна сказаць, стаяла ля калыскі БДУ. На Усебеларускім з’ездзе ён у сваім дакладзе запатрабаваў найхутчэйшага разгортвання работы па стварэнні універсітэта на Беларусі. Яго праект статута гэтага універсітэта быў надрукаваны ў 1918 г.

У лютым жа 1919 г. у Мінску пры губернскім Камісарыяце народнай адукацыі была створана камісія ў складзе 8 чалавек пад старшынствам Карскага, якая распачала падрыхтоўчыя работы па арганізацыі Беларускага універсітэта. Літаральна за 2 месяцы гэтая камісія ўжо мела магчымасць абмеркаваць свае напрацоўкі ў Маскве і разгарнула падрыхтоўчыя курсы для жадаючых паступаць ва універсітэт. На іх чытаў і Карскі.

Толькі праз год камісія ўзнавіла сваю работу, калі Мінск быў вызвалены ад польскіх войскаў. І зноў акадэмік Карскі працаваў у ёй. Архівы захавалі пратаколы многіх пасяджэнняў гэтай камісіі (як у Мінску, так і Маскве), на якіх Карскі неаднойчы выступаў з дакладным бачаннем таго, якім павінен быць новы, беларускі універсітэт. І БДУ, як аснова і ўсёахопная сфера сацыяльна-палітычнага жыцця новай дзяржавы, як крыніца культуры, адукацыі, навукі для беларускага народа, распачаў сваю дзейнасць ужо летам 1921 г.

Акадэмік Яўхім Карскі меў да гэтага найважнейшага выніку XX ст. для Беларусі першаснае дачыненне. Больш за тое, яго кандыдатура вылучалася на пасаду першага рэктара БДУ, але з-за палітычных гульняў была ў рэшце рэшт адхілена.

Падыходы ж Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага, якія ён сфармуляваў у сваім праекце [2], а больш за ўсё яго палітычныя погляды не дазволілі яму, у адрозненне ад Карскага, прыняць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы абвешчанага 25 лютага 1919 г. Пастановай ЦВК ССРБ адкрыцця БДУ. Але калі Карскі не змог распачаць у БДУ выкладчыцкую працу, то Доўнар-Запольскі хоць на кароткі час, з кастрычніка 1925 г. па лета 1926 г., чытаў лекцыі студэнтам беларускага універсітэта [3].

Яны абодва шмат зрабілі для таго, каб на выкладчыцкую працу ў Мінск былі сабраны лепшыя прадстаўнікі універсітэцкай адукацыі і навукі. М. В. Доўнар-Запольскі гэтую агітацыю праводзіў, знаходзячыся ў Кіеве, а потым — у Баку [4], Карскі — непасрэдна праз свой удзел у рабоце камісій па стварэнні БДУ (сустаршынёй маскоўскай ён быў разам з рэктарам МДУ Вячаславам Пятровічам Волгіным [5], а сам кіраваў працай мінскай). Такім чынам, яны абодва свае тэарэтычныя распрацоўкі рэалізоўвалі праз канкрэтную стваральную дзейнасць.

У гэтым сэнсе нельга не нагадаць прозвішчы найбольш вядомых членаў мінскай і маскоўскай камісій. Побач з Карскім і Волгіным працавалі



Ф. Ф. Турук, Л. С. Мінор, С. Д. Камінскі, М. А. Янчук, Л. С. Таль, М. Б. Кроль, М. М. Кулагін, А. А. Барзоў, П. І. Каразін, Б. М. Беркенгейм, А. А. Калантар. Д. М. Пранішнікаў і іншыя вядомыя на той час вучоныя. Акрамя іх дзейсную працу вялі прадстаўнікі ўладных органаў: у складзе камісіі знаходзіліся ў 1919 г. тагачасны старшыня ЦВК ССРБ А. Ф. Мяснікоў, член расійскай калегіі аддзела вну В. Т. Тэр-Аганесаў, пазней дзейсную дапамогу камісіям аказвалі старшыня СНК БССР А. Р. Чарвякоў, сакратар ЦБ КП (б) Б В. Г. Кнорын і, зразумела, нарком асветы БССР У. М. Ігнатоўскі і намеснік наркома асветы РСФСР М. М. Пакроўскі — два вядомыя гісторыкі.

Яшчэ адзін выбітны гісторык У. І. Пічэта, які, бадай, больш за іншых быў актыўным у сваіх дзеяннях па стварэнні БДУ, не толькі вынес на сваіх плячах цяжар вырашэння пытанняў кадравых, матэрыяльных, палітычных і г. д., без чаго нельга было распачынаць вучэбны і навуковы працэс, але і ў якасці першага рэктара БДУ зрабіў яго сапраўднай навучальнай установай вышэйшага ўзроўню. Гэта знакавая фігура ў гісторыі беларускага універсітэта, больш за тое — у гісторыі беларускай культуры ў цэлым. Яго роля яшчэ да канца не асэнсавана, як, дарэчы, і роля самога універсітэта.

Уладзімір Іванавіч быў першым рэктарам. І такім ён застанецца назаўсёды ў гісторыі універсітэта і Беларусі. Хаця ў 1947 г., калі Уладзімір Іванавіч памёр, у некралогу, надрукаваным у часопісе «Вопросы истории», ні слова не было згадана пра амаль дзесяцігадовы плённы перыяд жыцця рэктара і прафесара БДУ. Рэдакцыя палічыла за лепшае не акцэнтаваць увагу на тым, што менавіта ў Мінску гісторык спазнаў рэальнае ўвасабленне тэрміна «дзяржаўны» універсітэт, як таго патрабавала палітыка ўлад, і што такое сталінская «карающая десница». Ён не змог прыстасавацца да гэтай палітыкі. Таму толькі як эпізод у яго жыцці было адзначана, што Уладзімір Іванавіч вучыў і выхоўваў студэнтаў МДУ і «ряда других высших учебных заведений»[6].

Цікавая асаблівасць — большасць тых, хто ў складзе арганізацыйных камісій ствараў умовы для распачынання дзейнасці БДУ, потым (ці адразу, ці праз нейкі час) сталі яго першымі прафесарамі і выкладчыкамі. Гэта была тая эліта універсітэта, без існавання якой уявіць магчымасць дзейнасці менавіта універсітэта проста нельга. Вакол іх збіраліся іншыя, многія без адпаведнай высокай адукацыі, без практыкі выкладання ва універсітэце. Але такім чынам стваралася нацыянальная эліта, якая дазваляла беларусам мець свой універсітэт, бо інтэлект, веды, культура кожнага з прафесараў кампенсавалі хранічны недахоп вучэбнай літаратуры, стыхію вучэбных планаў, адсутнасць элементарных умоў для вядзення практычных і лабараторных ра-



бот і многае іншае. Кожны з іх сам быў нейкім асобным універсітэтам, факультэтам, кафедрай, бо толькі ён мог вызначыць і ўвасобіць у рэальнасць параметры і сутнасць гэтых галоўных структурна-арганізацыйных адзінак універсітэта як цэлага і непарыўнага арганізма. Таму не дзіўна, што дакументы 20-х гг. прозвішча таго ці іншага прафесара атаясамліваюць з дзейнасцю цэлай кафедры як асобнага вучэбнага і навуковага кірунку.

Амаль за паўтара месяца да распачынання вучэбнага працэсу ў БДУ дзяржаўны вучоны Савет зацвердзіў першую кагорту універсітэцкіх прафесараў: па факультэце грамадскіх навук — В. Г. Кнорын, С. Г. Гурвіч, В. Н. Дзякаў, В. Н. Іваноўскі, Д. А. Жарынаў, Д. П. Канчалоўскі, С. Г. Лазінскі, М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, У. І. Пічэта, І. М. Салаўёў, Ф. Ф. Турук, М. А. Янчук і інш. Па медфаку — Н. Н. Андрэеў, Б. М. Беркенгейм, А. А. Калужскі, М. Б. Кроль, В. В. Ляпёшкін і інш.[7]

Потым на кожным з пасяджэнняў Праўлення БДУ, якія рэгулярна праводзіліся, першым разглядалася пытанне аб кадравым папаўненні факультэтаў і кафедр.

За 20-я гг. архіўныя крыніцы называюць роўна 100 прозвішчаў прафесараў і 442 прозвішчы прадстаўнікоў так званага «научно-преподавательского состава»[8]. Праўда, гэтыя лічбы дастаткова ўмоўныя, бо яны прыведзены ў вопісу спраў, які быў падрыхтаваны работнікамі універсітэцкай кадравай службы ўжо ў 1938 г., тады як за папярэднія гады з кадрамі універсітэта адбываліся значныя launched пeратурбацыі, і далёка не ўсе змены знаходзілі адлюстраванне ў адпаведных паперах. Калі праз 17 гадоў спісы выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ, якія працавалі ў даваенны перыяд, былі складзены для перадачы асабістых спраў у дзяржаўны архіў, то ў ім адсутнічалі многія прозвішчы з папярэдняга, 1938 г. спіса, але было названа шмат новых — усяго 146 прозвішчаў прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, навукоўцаў [9].

Дастаткова цікавай старонкай імяннога летапісу БДУ можна назваць і тую, дзе прапісаны прозвішчы ўладальнікаў тых будынкаў г. Мінска, у якіх у 1921 г. размясціліся першыя тры факультэты БДУ, сталі праходзіць першыя заняткі, весціся першыя навуковыя даследаванні. Напрыклад, так і засталося б незгаданым у гісторыі імя мінскага купца Сакера, калі б яго «угловой каменный 2-этажный дом», пабудаваны яшчэ ў сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. [10], не прытуліў з лета 1921 г. Праўленне БДУ, яго бібліятэку, канцэлярыю, не даў бы пакойчык для пражывання самога універсітэцкага рэктара Пічэты. А прадпрымальнік Эмануіл Хайкін будзе заўсёды згадвацца на святкаваннях гадавін БДУ, бо ў будынку рэальнага вучылішча, якім ён валодаў да рэвалюцыі, 31 кастрычніка 1921 г. прафесарам Д. П. Канчалоўскім была прачытана першая лекцыя студэнтам.



Тое, што і сёння мы толькі пачынаем усведамляць неабходнасць мець поўную і дакладную інфармацыю аб тым галоўным, чым можа ганарыцца універсітэт і на што накіравана яго дзейнасць, сэнс існавання, — гэта навукова-педагагічны патэнцыял, які ўвасоблены ў прафесійным і агульнакультурным узроўні яго навукова-выкладчыцкіх кадраў аб чым сведчыць выданне кнігі «Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта». На жаль, ні сучасныя факультэты і НДІ БДУ, перад якімі была пастаўлена задача акрэсліць кола сваіх знакамітых папярэднікаў, ні складальнік дадзенага выдання не змаглі ў поўнай меры нагадаць прадстаўнікоў універсітэцкай эліты, дасведчана апісаць іх творы і жыццёвы шлях. З 569 кароткіх нарысаў толькі 90 прадставілі тых, хто працаваў у БДУ у даваенны час [11].

Нават калі ўзгадаць тых, каго мы з поўным правам можам называць сваімі калегамі-гісторыкамі, то вызывае павагу ўнушальны пералік прозвішчаў (У. І. Пічэта, У. М. Перцаў, М. М. Нікольскі, У. М. Ігнатоўскі, М. М. Шчакаціхін, В. Д. Дружчыц, М. В. Доўнар-Запольскі, Д. А. Жарынаў, Д. П. Канчалоўскі, С. Г. Лазінскі, Ф. Ф. Турук, А. М. Ясінскі, М. А. Янчук. Д. І. Даўгяла, Ф. І. Забела, К. І. Кернажыцкі, П. Д. Каляда, А. А. Савіч, В. А. Сербента, В. К. Шчарбакоў, І. Ф. Лочмель, А. П. П’янкоў і іншыя). Але не зусім усведамляецца роля, якую адыгралі гісторыкі ў станаўленні і развіцці alma mater беларускага цывілізацыйнага асяроддзя. Між тым з гонарам успрымаецца, як ужо адзначалася вышэй, што гісторыкі не толькі былі аднымі з самых актыўных арганізатараў БДУ і праваднікоў ідэі і практыкі універсітэта ў 20-я гг., але і ў змрочныя 30-я змаглі захаваць прыстойны яго ўзровень, а галоўнае, працягнуць сваю непасрэдную справу — весці навучальны працэс і навуковыя даследаванні на створаным у 1934 г. асобным гістарычным факультэце БДУ. Дзеля гэтага ў тагачасных умовах прыходзілася ахвяраваць многім, у тым ліку і жыццём. За выкладчыкамі БДУ улада і адпаведныя яе органы пільна сачылі, бо добра ўсведамлялі іх магчымасці ўплыву не толькі на студэнцкую моладзь, але і на ўсё грамадства. Таму ціск быў не толькі моцным, але і ўсёахопным. І калі ў 1930 г. дацэнту-медыку Я. М. Старобінскаму за непераход на беларускую мову выкладання ўсяго толькі была вынесена строгая вымова [12], а яго калегі прафесары П. А. Маўрадзіадзі, І. Т. Цітоў, М. Л. Выдрын, С. М. Рубашоў, М. П. Сакалоўскі, А. П. Бястужаў, А. К. Ленц, М. В. Колпікаў, як і прафесары іншых факультэтаў, былі папярэджаны [13], то дацэнт С. Л. Пеўзнер быў вызвалены ад пасады за тое, што ў сваёй выкладчыцкай працы «не овладел в достаточной степени марксистским методом»[14]. Але гэта былі толькі лагодныя меры ўздзеяння на выкладчыкаў БДУ, не адаптаваных да тых перамен, якія сталі адбывацца пасля разгортвання «крутого павароту», пасля адыходу ад новай эканамічнай палі-



тыкі. Шчыльны прагляд кадраў універсітэцкай інтэлігенцыі даходзіў да такой ступені, што некаторыя проста не вытрымлівалі. Усім вядома самазабойства У. М. Ігнатоўскага, а між тым архіўныя радкі сведчаць, што такі шлях абраў і прафесар БДУ Б. В. Чрэдзін [15]. Студэнтаў жа проста «выкідвалі» з універсітэта не толькі за тое, што яны, напрыклад, праз паэтычныя радкі спрабавалі адстойваць годнасць і краіны, і асобы, як гэта рабіў малады паэт Алесь Дудар, ці выступалі на сходах-«чысцілішчах» у абарону сваіх таварышаў, а нават за тое, што іх бацькі, каб пракарміцца, гандлявалі семкамі сланечніку [16].

Тэма рэпрэсій у гісторыі БДУ зусім асобна не закраналася. Між тым нават без спецыяльнай падрыхтоўкі можна згадаць дзесяткі прозвішчаў тых, жыццёвы шлях якіх абарваўся ў 30-я гг. Так, загінуў першы дэкан гістфака БДУ акадэмік Васіль Карпавіч Шчарбакоў, абвінавачаны як «нацыянал-фашыст», «шпіён» і г. д.[17] Дарэчы, у 1937 г. быў расстраляны з-за падобных абвінавачванняў і першы дэкан гістфака МДУ, ураджэнец Мінска Г. С. Фрыдлянд [18]. З 17 рэктараў БДУ 7 працавалі ў даваенны час, і толькі Парфен Пятровіч Савіцкі змог пазбегнуць «вывучэння» засценкаў АДПУ-НКУС. Рэктары ж Язэп Пятровіч Каранеўскі і Ананій Іванавіч Дзякаў у жудасны 1937 год былі беспадстаўна асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны [19]. Такая ўвага ўлад да БДУ зразумелая, калі зыходзіць з атаясамлівання тымі ж уладамі універсітэта з «рассаднікам» ведаў, чалавечай годнасці, духу абнаўлення і г. д. І калі на пачатку рэвалюцыйных пераўтварэнняў гэты сэнс існавання БДУ на зямлі Беларусі ўсяляк падтрымліваўся і ўшаноўваўся, то пачынаючы з другой паловы 20-х гг. і асабліва ў 30-я гг. стала зразумелым, што без мэтанакіраванага вынішчэння лепшых і прафесійных кадраў універсітэт зрабіць паслухмянай марыянеткай проста немагчыма.

Універсітэт за кошт сваіх, універсітэцкіх людзей, выкладчыкаў і навукоўцаў, як аб’ектыўная данасць, дзейнічаў у імя прагрэсу, культуры, цывілізацыі.

---

1 Протокол заседания культурно-просветительской секции 1-го Всебелорусского съезда 15 декабря 1917 г. // Беларус. гіст. часоп. 2001. № 4. С. 14—16.

2 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1. Л. 15—16.

3 Архіў БДУ. Описи дел Белгосуниверситета за период 1921—1932 годы. Л. 72.

4 Alma mater. Університет св. Володимира напередадні та в добу Украінскої революції. 1917—1920: матеріали, документи, спогади. Кн. 1. Київ, 2000. С. 179.

5 Кожушков А. И., Яновский О. А. Белорусский университет. Хроника событий (1919—1989). Мн., 1990. С. 8, 9.



6 Вопросы истории. 1947. № 7. С. 158.

7 *Пічэта У. І.* Беларускі Дзяржаўны Універсітэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі // Беларускі Дзяржаўны Універсітэт. 1921—1927: Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск, 1927. С. 36, 41, 42.

8 Архив БГУ. Описи дел Белгосуниверситета… Л. 72—81.

9 Архив БГУ. Опись. Личные дела и трудовые книжки профессорско-преподавательского, учебно-вспомогательного и адмхозсостава, аспирантов, студентов и лиц, сдавших кандидатский минимум и защитивших диссертации на соискание ученой степени кандидата наук, сданные на хранение ЦГАОР БССР, 1922—1941. Начато 7 июня 1955 г. и окончено 12 июля 1955 г., на 76 листах.

10 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 2132. Л. 80 зв.

11 Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта / Склад. А. А. Яноўскі. Мн., 2001.

12 НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1089. Л. 19.

13 Там жа. Спр. 375. Л. 105.

14 Там жа. Спр. 411. Л. 211, 212.

15 Там жа. Спр. 410. Л. 186; Звязда. 1930. 9 мая.

16 Бальшавік Беларусі. 1929. № 10—12. С. 15, 87; Узвышша. 1930. № 3. С. 14.

17 Архіў КДБ РБ. Спр. 9031. Л. 139.

18 Вопросы истории. 1994. № 7. С. 43.

19 *Яноўскі А. А., Зельскі А. Г.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў. Мн., 2001. С. 35, 58, 81.